вешчаным Сенату генерал-пракурорам 26 мая 1782 г., давалася «Наставление уездным казначеям». У ім указвалася, што казначэі павінны ажыццяўляць  казённыя зборы ў павеце і паведамляць аб прыбытках і выдатках грошай у казённую палату. Казначэй не меў права сам ні збіраць, ні распараджацца прыбыткамі, бо «*он есть хранитель тех денег, кои в казну приносятся, и ведет порядочные приходные и расходные книги*»[1]. У штаце казначэйства, акрамя павятовага казначэя, былі 4 прысяжных з адстаўных гвардыі ўнтар-афіцэраў, а для вядзення справаводства – рэгістратар, канцылярыст і капііст[2]. Павятовыя казначэйствы на тэрыторыі Беларусі працягвалі функцыянаваць пры ўсіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных зменах да 1917 г.

Паводле пастановы Камітэта міністраў ад 13 верасня 1838 г. са складу казённых палат былі выведзены кіраванні дзяржаўнымі маёмасцямі, казённымі сялянамі і казёнымі лясамі. Лясныя аддзяленні былі скасаваны, гаспадарчыя – ператвораны ў рэвізскія. Вінныя і саляныя аддзяленні з усімі справамі перадаваліся ў склад рэвізскіх аддзяленняў.

### 5.2. Губернскія па земскіх павіннасцях прысутнасці

*(А. П. Жытко, С. А. Талмачова)*

13 ліпеня 1851 г. былі зацверджаны «Правила нового устройства земских повинностей»[3], якія ўводзіліся ў дзеянне з 1 студзеня 1853 г. Паводле іх утвараліся **губернскія камітэты па земскіх павіннасцях і па земскіх павіннасцях прысутнасці.** Старшынёй губернскага камітэта, як правіла, быў губернатар, членамі – губернскі і павятовыя прадвадзіцелі дваранства, дэпутаты ад дваранства, старшыня казённай палаты, кіраўнік палаты дзяржаўных маёмасцей са сваімі падначаленымі – акруговымі і павятовымі начальнікамі і дэпутатамі ад гарадоў на чале з гарадскім галавой губернскага горада.

Спецыяльная прысутнасць складала  каштарыс павіннасцей і перадавала іх на разгляд у губернскі камітэт. Камітэты аб земскіх павіннасцях складаліся з агульнай прысутнасці і асобных па

[1] ПСЗРИ. Собр. 1-е. – Т. 21 (1781–1783). – № 15 405. – С. 506.
[2] НГАБ. – Ф. 2567. Воп. 1. Спр. 195. Арк. 232.
[3] ПСЗРИ. Собр. 2-е. Т. 26 (1800–1801). – Отд. 1. – № 25 398. – 483–-531.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паветах. У прысутнасці абмяркоўваліся фінансавыя справаздачы казённай палаты аб земскіх павіннасцях за апошнія тры гады і зацвярджаўся праект іх размеркавання на наступныя тры гады. Сюды ж з правам дарадчага голасу запрашаліся губернскі пракурор ці адзін са стрэпчых, акруговы начальнік шляхоў зносін, губернскі паштмайстар, камандзір батальёна ўнутранай варты і камандзіры частак, раскватараваных у губерні.

На пасяджэннях камітэта ў паветах, пад старшынствам павятовага прадвадзіцеля дваранства, збіраліся дэпутаты ад дваран і гарадоў, акруговыя начальнікі ведамства дзяржмаёмасцей. Яны абмяркоўвалі даныя, якія прымаліся за аснову пры размеркаванні будучых збораў, – аб колькасці зямельных угоддзяў, чыншавых артыкулаў, падатковых душ у павеце, рамеснікаў, наёмных службоўцаў, рабочых у гарадах і інш. Ухваленыя на 3 гады агульнай прысутнасцю камітэта аб земскіх павіннасцях праекты каштарысаў і раскладак прадстаўляліся ў Міністэрства фінансаў і пасля разгляду ў Дзяржаўным савеце накіроўваліся на зацвярджэнне імператару.

Спецыяльныя па земскіх павіннасцях прысутнасці вырашалі ўсе справы, звязаныя з паступленнем і выдаткоўваннем грашовых збораў з земскіх павіннасцей і выкананнем натуральных павіннасцей, а менавіта: укрывальніцтва ад акладу ўладальнікаў зямлі, пропускі ў спісах землеўладальнікаў, выключэнне з акладу прададзеных маёнткаў; аб гандлі на падрады і пастаўкі; зацвярджэнне і фінансаванне дагавораў і кантрактаў; адвод месцаў для вайсковых каманд пад лагеры, стрэльбішчы, пашы для коней; перавод натуральных павіннасцей у грашовыя; утрыманне школ, бальніц, фельчарскіх пунктаў, медперсаналу, настаўнікаў і інш.

Для палягчэння вядзення земскай гаспадаркі ў Беларусі ўлады абмяжоўваліся пераразмеркаваннем з 1867 г. спраў аб дзяржаўных земскіх павіннасцях паміж канцылярыяй харчовай камісіі пры губернатары і асобай па земскіх павіннасцях прысутнасцю[1]. Пасля далучэння да агульных дзяржаўных прыбыткаў дзяржаўнага земскага збору указам Сената ад 10 снежня 1874 г. скасоўваліся асобыя аб земскіх павіннасцях прысутнасці. З 1875 г. іх функцыі перайшлі да

[1] НДБ РДГА. – ДЗ 131. Адз. зах. 7. С. 1.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ